УДК 398 (882.6)

***Малашук І.М.***

# САЛЯРНАЯ СІМВОЛІКА ПРАЦОЎНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Характэрнай асаблівасцю беларускіх народных вераванняў і абрадаў з'яўляецца своеасаблівае перапляценне адметных рысаў старажытнага светапогляду з аграрна-побытавымі вераваннямі і абрадава-магічнымі дзеяннямі. Салярны культ, які знайшоў сваё адлюстраванне ў каляндарна-абрадавай паэзіі, даволі поўна прасочваецца і ў працоўнай абраднасці. Вядома, што жніўныя песні суправаджалі адзін з самых адказных момантаў у жыцці старажытнага земляроба – збор збажыны. Архаічныя ўзоры жніўнай паэзіі выразна нясуць на сабе адбітак міфалагічнага светасузірання. Яны даволі пераканаўча сведчаць аб тым, што былі закліканы, паводле думкі старажытнага чалавека, яшчэ няздольнага растлумачыць навакольны свет у яго рэальных прычынна-выніковых сувязях, паспрыяць захаванню збажыны ў час яе ўборкі, а таксама забеспячэнню ўрадлівасці нівы на будучы год. Збіраючыся на агледзіны палеткаў, каб пераканацца, як даспявае збожжа, у які дзень трэба выходзіць жаць, «гаспадар адпаведна неардынарнасці моманту апранаўся па-святочнаму, згодна з беларускай этнічнай традыцыяй, – у белае адзенне: белыя нагавіцы, белая сарочка, падперазаная поясам» [14, с.45]. У «пакрыванні поля» таксама прысутнічаў белы колер, магчыма, як сімвал шанавання сонца, у знак падзякі за яго жыццядайнасць: «Самая маладая нявестка, маладзіца, якая нядаўна прыйшла ў свёкраву хату, да ўсходу сонца адпраўляецца на ніву… Нажаўшы невялікі снапок жыта і абвіўшы яго наміткаю або палатнінай (натканае палатно заўсёды выбельвалі, таму яно было белага колеру – І.М.), маладзіца падкідвала накрыты сноп угору, прымаўляючы, пры гэтым: "Пакрыла ніўку на добрую спажыўку. Парадзі, Божа, наша збожжа!" [13, с.45]. Сонца валадарыла над нівай. Яно "налівала" зерне, падсушвала-выспельвала, і таму тут свяціла было на першым месцы.

Сонечны пачатак таксама прасочваецца і ў зажыначным абрадзе: "…гаспадыня, адпраўляючыся ў поле на зажынкі, закуску абавязкова завязвае ў абрус, якім быў накрыты стол у Светлую Нядзелю (на Вялікдзень – І.М.)» [17, с.174]. «Абрус, на якім стаялі велікодныя стравы, захоўваўся ў недатыкальнасці на працягу ўсяго года: ён, згодна з народнымі вераваннямі, ахоўвае пасевы ад граду, і таму пры з'яўленні градавых хмар гэты абрус рассцілалі на дварэ» [11, с.49]. Альбо калі гаспадар прывозіць дадому першыя нажатыя снапы, «перад варотамі рассцілае той жа абрус, якім быў пакрыты стол у Светлую Нядзелю, і па ім толькі ён можа ўвозіць воз з першымі снапамі. Гэта … робіцца для таго, каб Бог вартаваў дабро ад удараў маланкі і мышэй» [17, с.175]. Вядома ж, прыгадванне Бога – вынік больш позніх хрысціянскіх напластоўванняў, а ў раннім язычніцтве, ды і ў развітым таксама, мелася на ўвазе салярнае найвышэйшае боства, якое з'яўлялася ахоўнікам і заступнікам, а аб яго сонечнай прыродзе можа сведчыць велікодны абрус, што з'яўляецца матэрыялізаваным дачыненнем да веснавога адроджанага сонца. Такое меркаванне можа мець рацыю, таму што «абрады, суправаджаючыя пачатак і канец палявых работ, адрозніваюцца глыбокай старажытнасцю. Вядомы яны ў большасці выпадкаў на тэрыторыі ўсёй Расіі, ды і не толькі рускім, але і іншым славянам і нават неславянам» [10, с.302].

Аб старажытнасці жніўных абрадаў сведчыць шэраг песень, у якіх гучыць маленне, звернутае, адпаведна з язычніцкімі вераваннямі, да найвялікшага, міласэрнейшага дараўніка цяпла – сонца, якое чалавек на пачатку цывілізацыі свята абагаўляў: «Радзі, сонца, жыта і пшаніцу. // Радзі ярыну капамі. // Радзі, сонца, жыта і пшаніцу, // Поўны гумны стагамі…» [7, с.63]. Калі акрэсліваць гэтыя словы нейкім пэўным перыядам, то не сакрэт, што на світанку язычніцтва паняццяў «копы» і «гумны» яшчэ, відаць, не было ўвогуле, але генетычна яны ўзыходзяць да той эпохі светапогляднай асновай і ўтылітарнай формай, якія таксама з'яўляюцца прыкметай сівой старажытнасці.

Няцяжка ўявіць карціну сялянскай працы: поле і неабсяжная прастора, жняя, што па некалькі сцяблін зразае калоссе сярпом, наперадзе – яшчэ незлічоная іх колькасць. А працаваць даводзіцца пад гарачым, бязлітасна пякучым сонцам. І жанчына просіць спачування ў гэтага сонца, звяртаецца да яго, нібы да адухоўленай істоты, моліць не прыпякаць так моцна: «Да не запякай ты, жаркае сонца, // Майго белага ліца…» [7, с.264 – 265]; «Ой, не запякай цела маё бела, // А ліцо румяна…» [7, с.264].

Сам па сабе сюжэт «жняя папракае сонца за ранні ўзыход і позні заход» – адзін з тыповых жніўных сюжэтаў. Шырока распаўсюджаны. Маюцца дзесяткі варыянтаў запісаў яго, зафіксаваных на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Гэты матыў адносіцца да вызначальных у багатай жніўнай паэзіі. Яно і не дзіўна, бо так адметна і характэрна ў ім праявілася ўсё, што складае зместава-вобразную сутнасць песеннай класікі жніва. У кампазіцыйным плане ў такіх творах на першым месцы стаіць дыялог жняі з сонцам. У асобных варыянтах – жняі-сіраты. І гэта яшчэ больш узмацняе трагічнасць сітуацыі. Некаторыя варыянты маюць апавядальна-эпічны зачын, які нечым нагадвае казачныя пачаткі: «Дзеванька-сіротанька // За борам жыта жала. // За борам жыта жала // І з сонейкам размаўляла» [3, с.128].

Большасць песень, аднак, пачынаецца з прамога, непасрэднага звароту жняі да сонца. Тут многае яшчэ залежыць ад таго, якая бытавая сітауцыя пакладзена ў аснову вуснапаэтычнага твора: ці жняя працуе на сялянскім, уласным полі, ці на панскім, прыгонным. Выступала яна наймічкай-сірацінай або проста маладзіцай на свёкравым загоне. Такі дыялог надзвычай эканомна-ёмiста, сапраўды па-мастацку высвечвае як хатнія, сямейныя, так і сацыяльныя адносіны. На пранікнёна-сардэчны зварот-скаргу жняі сонца спагадліва «адказвае», часта проста акрэсліваючы, а ў некаторых выпадках і называючы пры гэтым сапраўднага віноўніка (віноўніцу) прыгнёту. Наступная песня дакладна гаворыць пра таго, хто прымушае маладую жанчыну працаваць да змогі на жніве, шчыраваць не разгінаючыся, не спадзеючыся на палёгку: «Не горся, малодачка, // На яснае сонейка, // А горся, малодачка, // На сваю свякраваньку, // Бо я раненька ўзыходжу – // Цябе ў полі знаходжу, // А позненька забягаю // Цябе ў полі пакідаю» [2, с.128].

У варыянтах з сацыяльнай накіраванасцю прыгадваецца гаспадар, або ягоная жонка, якія значна багацейшыя за жнейку-сірату, таму асабліва і не задумваюцца, крыўдзячы яе. Сімпатыі выканальніцы песні на баку гаротніцы-жанчыны, а гаспадары малююцца людзьмі, увогуле пазбаўленымі

***Малашук Ірына Мікалаеўна****, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры грамадскіх дысцыплін Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.*
*Беларусь, 213826, г. Бабруйск, вул. Савецкая, 77/ 48.*

міласэрнасці, чалавечнасці. «Паэтыка-выяўленчая і кампазіцыйная схема ўсюды амаль застаецца такая ж самая. Можна сцвярджаць нават, што кампазіцыя не простая, а даволі спрошчаная. Наступны фрагмент дыялогу, у якім «адказ» сонца нясе асноўную сэнсавую нагрузку, раскрывае псіхалагічны стан выканальніцы: «Малада малоданька, // Не дзіві ты на сонейка, // Да дзіві ты на пана: // Я й раненька ўзыйду – // Цябе ў полі знайду, // Я й позненька зайду – // Цябе ў полі пакіну» [13, с.65 – 66].

Цікавы прыём пераасэнсавання становішча жняі параўнальна да становішча сонца ўзмацняе ў дадзеным выпадку антыпрыгонніцкі настрой песні: «Сонейка, сонейка, // Ці было ты ў бога ў наймах?» [7, с.19].

Сацыяльныя матывы даволі часта гучаць у жніўных песнях: «Зашло сонца, ўзышоў месяц. // А нашага пана вядуць вешаць, // Вядуць яго на паветра, // Няхай жа ён праветрае, // Няхай жа ён праветрае, // Мо назаўтра палепшае» [7, с.89]; «Да іграла сонейка, іграла, // Нямнога ж яно іграла, // У хмарку схавалася, // Дажджу баялася. // Камарочкі мае, не кусайце мяне, // А кусайце паноў, // Не пускаюць што дамоў» [8, с.23]. Відавочна, што больш позния антыпрыгонніцкія матывы напластоўваліся на старажытныя язычніцкія ўяўленні аб архетыпе сонца як аб жывой істоце, якая «хавалася», «баялася», «не выглядвала», «не спачувала», «не заступалася» і г.д.

Земляробы імкнуліся ўлітасцівіць гэтую жывую істоту дзеля таго, каб яна засцерагала іх ураджай, а значыць, пастаянна спрыяла і самому жыццю. Адсюль, найперш, і абагаўленне сонца, у іншых песнях думка аб яго дабрыні і жыццядайнасці: «Да ўжо сонца за бор, за бор. // Пара, жнейкі, дамоў, дамоў. // Мы ж не жалі па месяцу, // А па яснаму сонцу, // Мы ж не бралі па талеру, // А бралі мы па Чырвонцу» [1, с.450]; «Дарагое ты соўнейка, // Гэ-эй, ды заходзь ты борздзенька…» [9, с.37].

Працягласць, тэрмін любой працы, занятку селяніна заўсёды адлічваліся па сонцу, жняя ў полі праводзіла ўвесь дзень з усходу да заходу, і час яе, адпаведна, фіксаваўся па сутачных пазіцыях сонца: «Сонейка каля елі, // Мы яшчэ нічога не елі. // Сонейка каля дубу, // Я палуднаваць буду. // Сонейка на заходзе, я ў двор на выходзе» [7, с.94 – 95]. Тым не менеї, часта згадвалася і пра тое, што не хапала часу, надвор'е не чакала, кожны імкнуўся ўсё зрабіць своечасова, у спрыяльных умовах, бо дождж мог і згнаіць добры ўраджай на карані, не даць ні ў якім разе яго сабраць. Таму нам зразумелы і тыя хваляванне і неспакой, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў жніўных песнях: «Сонейка нізка, // Вячэрайка блізка, // Ай, не выжнем! // Пташкі, злятайце, // Снапочкі знашайце…» [7, с.15].

Заход сонца, марудны ўзыход месяца – малюнак даволі характэрны для жніўных песень. Само нябеснае свяціла, што хавалася за лес, тым самым нібы пацвярджаючы, што і само яно стамілася, клікала жней у адваротную дарогу – дамоў, давала спадзяванні-надзею ў хуткім часе пакінуць «ніву-няволечку», вярнуцца да гаспадаркі, да сям'і: «Ужо сонейка – не раненька, // Іду дамойкі радзенька – // На цёплую вячэру, // На мягкую пасцелю» [7, с.112]; «Сонейка за бярозку, // А мы на дарожку!.. Да сонейка за гаёчак, // А мы і ў дварочак. // Вечар вечарэе, // Мая душа весялее…» [7, с.142]; «А сонейка котам, котам, // А мы скора дамоў пойдзем, // А сонейка за лясочкам, // А мы выйдзем на пясочак, // А сонейка за бярозу, // А мы выйдзем на дарогу» [7, с.143].

Цікавы прыклад знаходзім і ў вуснапаэтычных творах, зафіксаваных Е.Раманавым: «Да пара, жонкі, дамоў ісці, // Пагубляла зара ключы, // Каля постаці йдучы, // З сонейкам гукаючы, // А з месяцам жартуючы. // А хто тыя ключы знойдзець, // За караля замуж пойдзець!» [16, с.252]. Як бачна, прамяні ранняй зары асацыіруюцца з ключамі, якія з'яўляюцца салярным сімвалам.

Падчас зажынак нават згадваецца пра тое, што жанчыны варажылі адносна замужжа сваіх дочак: «Пакуль гаспадыня занята зрэзваннем і завязваннем свайго снапа, дочкі або сваячкі яе спяшаюцца хутчэй нажаць і звязаць па аднаму снапу. Потым кожная з іх ставіць свой сноп камлём на зямлю, уважліва назіраючы: у які бок ён упадзе? Туды, значыць, маладой і выходзіць замуж» [17, с.174-175].

Тое, што менавіта жанчына і яе лёс суадносіцца з сонцам, невыпадкова: напэўна, іх аб´ядноўвае, як мы ўжо не раз адзначалі, жыццядайны пачатак, а таму сямейная тэматыка займае немалаважнае месца ў жніўнай паэзіі: "Ой, соўненька да за лес, да за лес, // Нас тутака мядзведзь заесць. // Ой, соўненька завалілась, // Мне дадому захацелась. // У мяне ж дома не баценька, // Да ў мяне ж дома люты свёкарка" [7, с.168]. Вобраз сонца тут дазваляе адчуць і зразумець душэўны стан гераіні і знаходзіць нават матэрыяльнае выяўленне ў залатых атрыбутах жней – сярпах: "Жнейкі маладыя, // Сярпы залатыя, // Ой, рана, рана, // А к месяцу жалі, // К сонейку аддыхалі, // Ой, рана, рана" [7, с.460]; "Ніўка, ніўка! // Оддай мою сілку // На другую ніўку. // А я ж цябе жала // І сілку споцеряла. // Нашы жнейкі молодые, // Іх сярпы золотые" [17, с.181].

Цікавы сюжэт у песні, прыведзенай П.Шэйнам: "Ой зялён дуб, зялён, // Ой вясёл наш пан, вясёл, // Дай по полю летаючы, // Своіх жэнчыкоў прыпомінаючы: // Вы жэнчыкі молодые, // У вась персценькі золотые, // Не дожаўшы, не пойдзем, // Ночаваці не будзем.// Ой золото, золото, // Ой на току молочено, // Ой на прыпечку навеяно. // Ой панок наш молодзёнек, // Дай вельмі разуменок. // Хто золото пералічыць, // Тот на войну не поедзе" [18, Т.1, с.277]. Тут сустракаецца даволі рэдкі вобраз "золата – зерне". Паколькі золата – матэрыяльнае выяўленне сонца, то няцяжка ўгледзець сімвалічны салярны змест зерня. Пацвярджэнне гэтаму знаходзім яшчэ ў адным народным творы: "Сонейка-каласочак, // Каціся за лясочак: // Так жа нам прынадаела, // Ручкі-ножкі панямелі" [7, с.174]. Але ж можна правесці асацыяцыю і з тым, што "зерняткі сонцам налітыя", "сонцам наліваліся", "сонцам выспелыя" і г.д.

Сонцу надаецца на першы погляд азначэнне "каласочак", аднак параўнанне з сонцам і золатам зерня, коласа і хлеба – неад'емны атрыбут паэзіі жніўнага цыкла. Даволі яскрава гэта прасочваецца ў дажыначных песнях, што суправаджаюць пляценне вянка: "Ой котывся веночок // З шырокеі нівы, // З женцямі молодымі // Подкотывся под ворота: // "Выйдзі, пане, за ворота! // Выкуп венка з золота! // Не з золота венок вітый, // Да й з густого жыта, // Да й з колосістого, // А ще з ядреністого!" [12, с.146-147].

Вянок, які нават па форме нагадвае сонца, заўсёды «коціцца», як сонца па небе, маючы таксама і ўнутраны салярны змест: «Котывся веночок по полю, // Просівся женчікув до дому: // «Ідете, женчыкі, до дому, // Занесете мене в стодолу, // Положіте мене в сторону, // Ой то я пойду на ніву, // Ой а мне на ніве годына. // Ой а мне в стороне гостына!» // – «Отчыняй нам, пане, ворота: // Несемо веночок з золота, // Ой не з золота, с кропівы, // Бо ще мы горелкі не пілі!» [12, с.147].

Гэтае параўнанне тут ужыта таму, што вянок, як і само зерне, «вырашчаны», «выгадаваны» сонцам, якое ўспрымаецца як чулая матуля, асабліва ў адносінах да ўраджаю, якое таксама хвалюецца і за сваіх «дзяцей» – людзей працы: «– Дзе, вяночак, ты радзіўся, // Якой расой абмываўся, // Якім сонцам гадаваўся? // Адказаў вяночак маці // Аб сваім ён родзе і званні: // - Ой, я сонцам гадаваўся, // У праменнях яго купаўся, // Часам раннім красаваўся, // З ночкай у гульнях забаўляўся» [7, с.435]. Суаднясенне зерня і звітага вянка з сонцам можна разглядаць далей і прасачыць узаемную сувязь з сонцам ужо гатовага, спечанага хлеба: «…А ў печы румяна, // Да на стале кахана. // Да на стале, як

сонейка, // Гаспадарам на здаровейка» [7, с.527 – 528]. Пацвярджэнне гэтаму знаходзім у Я.Карскага, які звяртае ўвагу на тое, што ў дажыначных песнях даволі часта сустракаецца прыгадванне Раю. Даследчык згаджаецца з А.Патэбнёй у тым, што адбылося «пранікненне Раю ў дажыначныя песні з вясельных, дзе рай з'яўляецца эпітэтам каравая. Аб каравае ў многіх вясельных песнях гаворыцца, што ён пасланы ад Бога, што ён «з раю», адтуль жа, адкуль устае сонца («з раю сонечка встае») і свеціць месяц: «Свити, мисяцю, з раю // Нашому короваю, // Абы був коровай красний, //А як сонийко ясний…// Ой раю, ти мий раю, // Пшенишний короваю…» [10, с.309].

Рытуальны хлеб у выглядзе шчыта, які павінен быў увасабляць сабою сонца, таксама ўжываўся ў даўніну ў святкаванні дажынак. «Заканчэнне жніва некаторыя славянскія плямёны адзначалі ў старажытнасці так. Народ адусюль збіраўся вакол капішча Святавіда, як віноўніка ўраджаю. Жрэц з рук бостава браў рог, за год напоўнены вінам, прадказваў па яму дастатак, ці недахоп, на будучы год. Потым, пасылаючы народу добрае павучанне, распавядаў яму, ці шчодрай рукой ён павінен ужываць сабраны ўраджай, ці беражліва, у чаканні будучага недахопу. Пад канец прадказання вяшчун укладваў у рукі бостава рог, напоўнены свежым вінам, а сам хаваўся за велізарным калачом, ці караваем хлеба, які быў спечаны на мёдзе і які… прыносілі ў ахвяру боству (цяпер гэтая ахвяра з'яўляецца вянком з каласоў); закрываючыся гэтым хлебам, як агромністым шчытом, пытаўся ў людзей, ці бачны ён за калачом. Калі яму адказвалі, што бачны, то тады вяртаўся назад да алтара і прасіў Бога дараваць у будучым годзе такое багатае жніво, каб сяляне маглі прынесці яму ў ахвяру значна большы калач» [12, с.181].

Завяршальны цыкл паэзіі беларускага земляробчага календара складаюць восеньскія песні. Гэта песні той пары года, калі вясковы жыхар завяршаў збіраць апошні ўраджай на нівах і не меней шчодрыя дары прыроды. Як адзначае А.Багдановіч, «у жыцці земляроба гэта самы шчаслівы час – час адноснага дастатку, калі ў бедняка ёсць хлеб на стале, а ў багатых, «як князі, скірды шырока сядзяць, падняўшы галовы». Адсюль зразумела, чаму народ называе «багачом» свята, што супадае з часам канчатковага збору ўраджаю і гаспадарчага багацця. Але ёсць факты, якія вымушаюць думаць, што «багач» – адно з земляробчых боставаў дахрысціянскага перыяду, адна з іпастасяў… Дажджбога сонца, бога дастатку, багацця, на што паказвае і само імя яго. Уяўленне аб гэтым бостве сцерлася ў памяці народа, але ўказанні на тое, што ён, гэты бог, некалі займаў вядучае месца ў вераваннях беларуса, захаваліся ў абрадах» [4, с.123]. Галоўную ролю ў абрадзе гэтага святкавання іграе «багач» – «лубка» жыта са ўстаўленай у яе свечкай. Ці не прагледжваецца ў гэтым міфічна-абрадавае спалучэнне зерня, хлеба – сімвалу дабрабыту – з свечкаю – сімвалам светланоснага пачатку,…правобразам сонца Дажджбога, крыніцы святла і разам з тым апекуна земляробства, значыць, бога багацця і дабрабыту? Вядома ж, цяжка прыдумаць больш простую і, разам з тым, адпавядаючую сімвалізацыю сонца, якая гэтак поўна адпавядала першабытнаму ўяўленню аб ім як аб бостве земляробства. Тая акалічнасць, што святкаванне «багача» амаль супадае з часам асенняга раўнадзенства, таксама сведчыць аб прыналежнасці гэтага свята да сонечнага культа. Бясспрэчна, што адно са святкаванняў у гонар нябеснага свяцілы павінна было мець месца восенню. Калі каляды прысвячаліся зімняму сонцу, масленіца і Вялікдзень – веснавому, Купала – летняму, то была б не зразумелай адсутнасць свята ў гонар асенняга сонца. Тым больш, што ў гэты час старажытны чалавек заўсёды мог убачыць плён дабрадзейнай дапамогі сонца. «Нашы прашчуры заўважалі, што на працягу года, у сувязі са зменамі сонца на небе, утвараюцца чатыры пары году – зіма, вясна, лета, восень. Калі на Каляды сонца нарадзілася ці адрадзілася, а вясной пад ягонымі праменнямі аджыла прырода, дык на Купалле яно стала зусім моцным, як сталы чалавек. Але набліжаючыся да восені, яно стала старэць і слабець, а ў познюю восень яно аслабела, дык і прырода стала заміраць. У гэты час сама прырода наводзіла сум на чалавека: птушкі не пяюць, кветак няма, трава пасохла, лес агаліўся ад лісця і апусцеў… А за гэта і восеньскія песні такія працяжныя, такія смутныя, такія цягучыя» [5, с.51].

Цікава, што ў адрозненне ад ўсіх іншых каляндарных песень восеньскія не канцэнтруюцца вакол аднаго якога-небудзь свята, адной падзеі, урачыстасці. Яны не нясуць у сабе амаль ніякіх абрадавых момантаў. У іх на першы план выразна выступае жыццёвая гаспадарская аснова. Гэтыя песні гучалі над даспелымі аўсянымі палеткамі, у час уборкі проса і грэчкі, над ільнянішчам, калі рвалі лён, даносіліся з лесу: «Па бару хаджу, // Па бару хаджу, я ягадкі бяру! // Памачылася, // Урасілася, // Я й пазябла дужа! // А ты, сонейка, // Да ты, жаркае, // Абагрэй ты мяне!» [6, с.326]. Тут гучыць непасрэдны зварот-заклінанне да сонца, просьба аб дапамозе, з якой звярталіся да ўсемагутнага вярхоўнага бостава. Можам канстатаваць наступнае: як і летнія жніўныя, палявыя працоўныя песні восені ўводзяць слухача ў атмасферу працы на полі. «Але ў адрозненне ад першых…, восеньскія песні, будучы яшчэ менш жніўных скрэпленымі абрадавым стрыжнем, развіваюць лірычны пачатак адносна (на ўзроўні каляндарнай песеннасці) больш свабодна. Гэтым «лірычным аслабаненнем» у значнай ступені тлумачыцца і другая асаблівасць восеньскага цыкла – вялікае месца ў ім умоўна прымацаваных да восені лірычных песень найбольш схільных прымяркоўвацца менавіта да дадзенага перыяду. Такім чынам, восеньскі цыкл з'яўляецца адным з самых лірычных сярод усіх цыклаў гадавога земляробчага круга…» [15, с.35 – 36].

Тэндэнцыяй адмацавання ад абрадавасці можа быць растлумачана і яшчэ адна асаблівасць восеньскіх песень – іх глыбокі псіхалагізм, сугучны характару восеньскай прыроды. У ланцугу суадносін песня – земляробчая абраднасць – прырода шчыльнасць сувязей, такім чынам, тут пераакцэнтуецца ў напрамку звяна каляндарная песня – прырода. Свет прыроды арганічна ўвайшоў у асеннюю паэзію. Даволі старажытны сюжэт, у якім адухоўленыя сілы прыроды, часцей за ўсё сонца і месяц, вядуць паміж сабой размову: «Ой, за лесам, за борам, // Ой, за сінім азёрам, // Ой, там сонейка йграе, // З месяцам размаўляе: // – Пытаю цябе, месяцу… Ці раненька ты заходзіш, // Ці позненька усходзіш? // – Што табе, сонейка, да таго, // Да заходу майго?… Я зыду змяркаючы, // А ўзыйду світаючы…» [6, с.107]. Відавочна, тут прасочваецца сувязь песні з асенняй парой года, калі сонца-свяціла губляе магутную, вясною б, здавалася, нерастрачаную сілу, вельмі нагадвае ў нечым старога слабога чалавека, якому неўзабаве трэба памерці, пра жыццё ўжо на тым свеце, недзе, зноў-такі, у сонечным вырai-раі. Адсюль і зварот сонца да месяца, з якім яно пастаянна знаходзіцца ў стане своеасаблівага спаборніцтва і не жадае ні ў чым саступаць. Праўда, такія сцэны з жыцця асенняй прыроды, такія асаблівасці асенняга пейзажу сустракаюцца ў творах гэтага цыкла даволі рэдка. За час развіцця чалавецтва размежаванне дня і ночы, перыяд валадарання сонца і месяца атрымалі пастаяннае значэнне.

У цэлым жа па сваім ідэйна-тэматычным змесце восеньскія песні стаяць блізка да пазаабрадавай любоўнай лірыкі. Матывы будучага замужжа, вяселля надаюць своеасаблівы характар тэматыцы ўсяго асенняга цыкла, дамінуюць у ім. Апошняе тлумачыцца, відаць, тым, што раней на Беларусі якраз на восень прыпадала асноўная

колькасць вяселляў. Ураджай быў сабраны, і можна было гуляць сямейныя ўрачыстасці. Адметнай рысай такіх восеньскіх твораў з'яўляецца абавязковая прысутнасць у іх сонца, якое быццам бы да драбніц перадае настрой закаханых: «А на гарэ дуб зялён кудравісты, // Іграй сонца із зарою. // А на тым дубочку // Ганначка сядзела, яна песню пела» [6, с.168]; «Ды на полі ліпа з сонейкам іграець, // Рана, рана! // Малады маладзец коніка сядлаець, // А старшы брацітка яго намаўляець: // - Выбірай, брацітка, на ніўцы, // А не выбірай, брацітка, на рынку: // На рынку дзевачкі хваслівы, // А на ніўцы дзевачкі працаўлівы» [6, с.154].

Гучыць у восеньскіх песнях і згадванне аб нешчаслівым замужжы. Даволі часта гэта можна растлумачыць бяспраўным становішчам жанчыны ў сям'і. Нягледзячы на тое, што сілы прыроды, а часцей усяго сонца, спрыяюць жанчыне-працаўніцы, яна не заўсёды можа пахваліцца асабістым, сямейным шчасцем: «– Маё шырокае падвор'е, // Чаму вадою заплыло? // Ці табе сонца замала? // – Свяціла сонца ў ваконца, // Павеяў ветрык з загор'я // На маё нізкае падвор'е. // – Маладая дзевачка, чаго ты замуж хацела? // Ці бацькава роскаш дадзела, // Ці ад людзей павагі не мела? // – Была мне роскаш у татачкі, будзе павага ў свякроўкі, // Будзе знявага ў мілога» [6, с.196]; «Эй, за лес сонца закацілася, // Эй, донька ў мамкі загасцілася… – Ой, выела вочкі замужжайка, // Ой, выдрала вочкі падружжайка, // Ой, спутала ножкі падружжайка, // Ой, спутала ножкі замужжайка» [6, с.227]. Відавочна, што перамога над горам, сямейнымі неладамі асацыіруецца ў восеньскіх песнях з жаркім сонцам і яго бляскам: «…– Тады ў госці буду, як гора забуду, // А ў леце ў карэце // Ад жаркага сонца…» [6, с.251].

Як бачна, працоўная абраднасць беларусаў мае ў сваёй аснове традыцыі надзвычай даўняй старажытнасці, яна прасякнута салярным культам, які ўскладняўся яшчэ і спалучэннем са своеасаблівым дамінуючым земляробчым культам. Таму ў жніўных абрадах і песнях сонца паўстае як адвечная міфалагічная крыніца цяпла, жыцця і ўраджаю, заступнік абяздоленых сялян-працаўнікоў, які пастаянна дапамагае ім у каханні, пры вырашэнні складаных сямейных пытанняў, мае нават пэўнае матэрыяльнае выражэнне ў выглядзе сонечна-залатога зерня, калосся, хлеба, або сплеценага на свята вянка-кола. А восеньскі цыкл у гадавой абраднасці беларусаў выконвае функцыю «завяршальных дзён» працоўнага перыяду, калі, на думку першапродкаў, сонца паміраե, а сабраны ўраджай сімвалізуе яго далейшую жыццядайнасць, з чым і звязана даволі распаўсюджаная тэматыка вясельна-сямейных сюжэтаў у восеньскіх песнях.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Брэсцкая вобласць / Склад. В.А. Захарава. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1973.–302 с.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / Уклад. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка, музычнай часткі – У.І. Раговіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1989.– 302 с.
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / Уклад. В.Д. Ліцвінка. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 302 с.
4. Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этнографический очерк (Репринт. изд.).– Минск: Беларусь, 1995. – 186 с.
5. Варлыга А. Чатыры ўрачыстасці. – Нью – Йорк: Заранка, 1970. – 53 с.
6. Восеньскія і талочныя песні / Склад. А. Ліс, уклад. С.Т. Асташэвіч; муз. часткі В.І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.
7. Жніўныя песні. Рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.
8. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1990. – 440 с.
9. Зянько У. Спадчына маёй маці / Укл. В.Ліцвінка. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 303 с.
10. Карскі Я. Беларусы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 640 с.
11. Коваль У.І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. – Гомель: Беларускае агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.
12. Крачковский Ю.Ф. Быт западнорусского селянина. – М., 1874. – 212 с.
13. Ліс А.С. Жніўныя песні. - Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 238 с.
14. Ліс А.С. Песню – у спадчыну: Мастацтвазнаўчыя артыкулы. – Мінск.: Маст. літ, 1989. – 295 с.
15. Мажэйка З.Я. Песні беларускага Паазер'я. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 150 с.
16. Романов Е.Р. Белорусский сборник. – Киев: Тип. Малкина, 1887. – Вып. 3. – 445 с.
17. Шейн П.В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями. – СПб., 1874. – 548 с.
18. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. – СПб. – 1887 – 1902. – Т. 1 –3.


УДК 882.6(092)

***Ненадавец А.М.***

# ТЭМА ПАЛЯВАННЯ Ў ТВОРАХ Я.ЛУЧЫНЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ "ПАЛЯЎНІЧЫХ АКВАРЭЛЬНІКАЎ З ПАЛЕССЯ")

Старыя людзі навучалі маладзейшых, што ні ў якім разе нельга пагарджаць спрадвечнымі правіламі палявання. Добра, што здаровы і вынослівы, пахвалёна, што адчайны і смелы, але ніколі не трэба забывацца, што з таго боку таксама паўстане дастойны сапернік. І вылезе з нетры ці са свайго логава ён не проста для таго, каб напалохаць або папярэдзіць. Звер рэдка калі даруе промах, хіб ў паводзінах. Ён з парушальнікам свайго спакою разлічваецца жорстка і бязлітасна. Кожны з паляўнічых, вядома ж, прыкрывае ўласны пралік нейкай сямейнай ці сацыяльнай неабходнасцю. Так і ў Грышкі (галоўнага героя) атрымалася.

Я й думаю сабе: галубцы вось Уляне
Адзін мядзведзя пасправбую аблажыць,
Каб сведкі мне не мець, паклапачуся скрыць,

***Ненадавец Аляксей Міхайлавіч***, *доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры Грамадскіх дысцыплін БФ УА "БДЭУ".*
*Беларусь, 213826, г. Бабруйск, вул. Савецкая, 77/ 48.*